Выхаванне асобы дзіцяці праз інтэлектуальныя гульні

Л.А. Бузук, педагог-арганізатар 1 катэгорыі

Ужо больш як пяць гадоў у нашай школе дзейнічае інтэлектуальны клуб “Савяня”, які наведваюць вучні 5 - 11 класаў. Папулярнасць інтэлектуальнага руху сярод дзяцей расце з году ў год. Амаль у кожнай паралелі ёсць каманда. Лічу, што галоўнае – гэта скласці згуртаваную і моцную камнду, правільна падабраць дзяцей. Спачатку запрашаю ўсіх жадаючых на заняткі клуба “Савяня”, а застаюцца самыя працавітыя і вытрыманныя. Кожная трэніроўка патрабуе ад дзяцей пільнай увагі, напружанай інтэлектуальнай работы. Вядома, дзеці ёсць дзеці, таму не абыходзіцца без гумару і цікавых зносін. Паседжанне клуба – заўсёды творчы і цікавы працэс, дзе меркаванне кожнага слухаюць з увагай.

Члены клуба ўдзельнічаюць не толькі ў школьных турнірах, але і ў гульнях раённага і абласнога ўзроўняў. Каманды нашай школы неаднаразова станавіліся ўладальнікамі кубкаў клуба “Наваградскія волаты” імя Б. Кіта. Каманды “Рамонкі” (кастрычнік 2010 года) і “Войска Міндоўга” (кастрычнік 2012 года) сталі ўдзельнікамі міжнароднага турніра па інтэлектуальных гульнях сярод школьнікаў “Несцерка”. Члены гэтых каманд – частыя госці ў школе. Сваю традыцыю быць наперадзе яны перадалі ў надзейныя рукі, што ўжо даказалі старэйшыя ювеналы – каманда “Сузор’е”, якая заняла 1 месца сярод старэйшых ювеналаў у XVI сінхронным чэмпіянаце вобласці па гульні “Што? Дзе? Калі?”. Члены гэтай каманды прадстаўлялі наш раённы інтэлектуальны клуб “Наваградскія волаты” на VIII чампіянаце вобласці па інтэлектуальных гульняў сярод старэйшых ювеналаў. Каманд-удзельніц было трыццаць пяць. Чэмпіянат складаўся з двух гульняў: “Что? Дзе? Калі?” і “Свая гульня.” Члены нашай каманды занялі дзесятае месца у гульні “Что? Дзе? Калі?”, а ў “Сваёй гульні” – пятнаццатае.

Каманды малодшых ювеналаў таксама не адстаюць ад старэйшых. Каманда 7 - х класаў “Пазітыў” (капітан Анжаліка Лішко) заняла першае месца, а “Цудоўная шасцёрка” 8 – ых класаў (капітан Сафія Рафаловіч) – трэцяе ў раённым турніры І Рэспубліканскага чэмпіянату гульні “Што? Дзе? Калі?” сярод піянерскіх дружын. Члены каманды “Пазітыў” будуць прадстаўляць наш раён на абласным этапе турніра.

Гісторыя перамог бярэ пачатак з 2003 года, калі каманда СШ №4 “Дыскрымінанты” (капітан Дзмітрый Ляўковіч) стала пераможцай у раёным турніры і ўвайшла ў дзесятку мацнейшых каманд вобласці. Трэнерам рабят была Наталля Міхайлаўна Макрушыч.

У склад клуба зараз  уваходзяць 4 каманды: старэйшыя ювеналы каманда  “Сузор’е” (капітан Соф’я Забелінская) і  каманда “Савяняты” (капітан  Софія Рафаловіч), малодшыя ювеналы каманда “Пазітыў” (капітан Лішко Анжеліка) і каманда “КПДз” (капітан Паліна Кот).  Трэба адзначыць, што рабяты не толькі паказваюць высокія  вынікі ў гульнях “Што? Дзе? Калі?”, але і з’яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі алімпіяд, конкурсаў і грамадскага жыцця школы.